**Вучэбная дысцыпліна “Уводзіны ў літаратуразнаўства”,**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 – 0232-01 “Беларуская філалогія. Прафілізацыя: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць”: дзяржаўны кампанент<br>Прапедэўтычны модуль |
| **Кароткі змест** | Літаратуразнаўства як навука: прадмет, задачы і структура курса. Літаратурныя роды і жанры; эпас як род літаратуры. Драматургія як род літаратуры. Лірыка і ліра-эпас: асноўныя родавыя і жанрава-відавыя прыкметы. Асноўныя сістэмы вершаскладання. Прынцыпы аналізу мастацкага твора; асноўныя элементы зместу. Форма літаратурнага твора. Іншасказальнасць як функцыя мовы мастацкай літаратуры. Фоніка і інтанацыйна-сінтаксічная арганізацыя тэксту як важнейшыя кампаненты яго мастацкай цэласнасці. Літаратурны працэс: яго стадыяльныя агульнасці і мастацкія напрамкі. Літаратурная плынь, школа і іх роля ў мастацкім працэсе. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт **павінен ведаць***:*<br>- асноўныя тэарэтычныя паняцці, звязаныя з эстэтыкай і паэтыкай літаратурнага твора, літаратурным працэсам;<br>- сістэму літаратуразназ^іых дысцыплін і іх сувязі з іншымі гуманітарнымі навукамі і дапаможнымі галінамі літаратуразнаўства;<br>- спецыфічныя асаблівасці эпасу, лірыкі і драмы як родаў літаратуры, вершаванай і празаічнай формы выказвання, асноўныя складнікі стылю пісьменніка;<br>**павінен умець: -** вызначаць асноўную ідэйную накіраванасць, тэматыку, праблематыку, пафас літаратурных твораў;<br>- разглядаць літаратурны твор у арганічным адзінстве яго зместу і формы;<br>- вызначаць асаблівасці стылю пісьменніка, супастаўляць творчыя індывідуальнасці розных мастакоў слова;<br>- аналізаваць літаратурны твор, выяўляць яго вартасці і магчымыя недахопы;<br>**павінен валодаць: -** належным комплексам сучасных тэарэтыка-літаратурных тэрмінаў і паняццяў, асноўнымі прынцыпамі аналізу літаратурных твораў, неабходнымі для глыбейшага спасціжэння гісторыка-літаратурных курсаў, напісання курсавых, семінарскіх і дыпломных прац па літаратуры.<br>Патрабаванні да прафесійнай **кампетэнтнасці** спецыяліста:<br>БПК-14 Скарыстоўваць эфектыўныя сродкі і метады навучання беларускай мове і беларускай літаратуры, рэалізоўваць розныя формы арганіза навучання і кантролю ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. |
| **Пострэквізіты** | “Тэорыя літаратуры”, “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Гісторыя замежнай літаратуры” |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін – 108 (3 заліковыя адзінкі); аўдыторных гадзін – 52, у тым ліку лекцыйных – 30 гадзін (з іх кантралюемая самастойная работа – 6 гадзін), практычных – 22 гадзіны. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 1-ы семестр, тэст, экзамен |